## “Не пакладаючы рук”
## Трэнажор для адпрацоўкі ўменняў і навыкаў па раздзеле “Фразеалогія”

**Ірына Уладзіміраўна Цімохава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі г. Быхава

Дадзены трэнажор складаецца з 20 заданняў у выглядзе тэстаў, якія прызначаны для адпрацоўкі ўменняў і навыкаў па раздзеле “Фразеалогія”.
Тэст **“Не пакладаючы рук”** можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы ў профільных 10-х, 11-х класах, а таксама для падрыхтоўкі навучэнцаў да цэнтралізаванага экзамену (цэнтралізаванага тэсціравання), алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Ні пуху ні пер’я вам!

### Тэст “Не пакладаючы рук”

**Заданне 1.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Як снег на галаву.<br>Б. Як пшаніцу прадаўшы.<br>В. Як сам не свой.<br>Г. Як кот з сабакам. | 1. Мае значэнне “моцна ўсхваляваны, у стане роспачы”.<br>2. Мае значэнне “быць з кімсьці ў дрэнных адносінах”.<br>3.Мае значэнне “дужа павольна”.<br>4. Мае значэнне “з’явіцца нечакана, без папярэджання”.<br>5. Мае значэнне “спаць моцным сном”. |

**Заданне 2.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. … на карандаш.<br>Б. … на вудачку.<br>В. … язык аб зубы.<br>Г. … ў вочы. | 1. Лезці<br>2. Ведаць<br>3. Браць<br>4. Біць |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| | 5. Клюнуць |

**Заданне 3.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Так сабе<br>Б. Да адвалу<br>В. За так<br>Г. Чын чынам | 1. Мае значэнне “бясплатна, дарэмна”.<br>2. Мае значэнне “пасрэдна, ні добра, ні дрэнна”.<br>3.Мае значэнне “празмерна, больш, чым трэба”.<br>4. Мае значэнне “калі-нікалі, не пастаянна”.<br>5. Мае значэнне “як належыць”. |

**Заданне 4.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Выводзіць на дарогу<br>Б. Выводзіць у поле<br>В. Выводзіць на чыстую ваду<br>Г. Выводзіць са строю | 1. Ашукваць<br>2. Выкрываць<br>3. Выбыць<br>4. Адыходзіць<br>5. Дапамагаць |

**Заданне 5.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Выпусціць з рук<br>Б. Прыйсці да ладу<br>В. Вадзіць дзяды<br>Г. Лістам слацца | 1. Дагаджаць<br>2. Дамовіцца<br>3. Забыцца<br>4. Страціць<br>5. Драмаць |

**Заданне 6.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што

некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Выпускаць з галавы<br>Б. Матаць на вус<br>В. Вастрыць вушы<br>Г. Вочы мазоліць | 1. Выкрываць<br>2. Дакучаць<br>3. Прыслухоўвацца<br>4. Запамінаць<br>5. Забываць |

**Заданне 7.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **сінанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Ганяць сабак<br>Б. Выводзіць з сябе<br>В. Напускаць туману<br>Г. Выводзіць у поле | 1. Адлежваць бакі<br>2. Каламуціць ваду<br>3. Дражніць гусей<br>4. Грэбці пад сябе<br>5. Абуваць у лапці |

**Заданне 8.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **сінанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Падпіраць вуглы<br>Б. Паднімаць хвост<br>В. Паказваць пяткі<br>Г. Падаць духам | 1. Драць нос<br>2. Вешаць галаву<br>3. Біць лынды<br>4. Вудзіць акунёў<br>5. Вастрыць лыжы |

**Заданне 9.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **сінанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Адзін у адзін<br>Б. Адзін на адзін<br>В. Адным мірам мазаны<br>Г. Адным вокам | 1. Абое рабое<br>2. Як на падбор<br>3. Краем вока<br>4. З вока на вока |

| | |
|---|---|
| | 5. Ні рыба ні мяса |

**Заданне 10.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **антанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Абы дзень да вечара<br>Б. Як у сук уляпіў<br>В. Адным мірам мазаны<br>Г. Глядзець зверху ўніз | 1. Здымаць шапку<br>2. Пападаць пальцам у неба<br>3. Скідаць ярмо<br>4. Не пакладаючы рук<br>5. З іншага цеста |

**Заданне 11.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **антанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Аднаго поля ягады<br>Б. Пальчыкі абліжаш<br>В. Галава садовая<br>Г. Абсевак у полі | 1. Здымаць шапку<br>2. Важная птушка<br>3. Расце ў роце<br>4. З царом у галаве<br>5. З іншага цеста |

**Заданне 12.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і **антанімічнымі** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Надзяваць на сябе аброць<br>Б. Глядзець зверху ўніз<br>В. Як у сук уляпіў<br>Г. Ставіць падножку | 1. Пападаць пальцам у неба<br>2. Скідаць ярмо<br>3. Гарадзіць плот<br>4. Саступаць з дарогі<br>5. Здымаць шапку |

**Заданне 13.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную

паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Як … да карэты | 1. кот |
| Б. Як … палку | 2. мыш |
| В. Як … пад венікам | 3. вол |
| Г. Як … на сала | 4. сабака |
| | 5. баран |

**Заданне 14.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. … горкая рэдзька | 1. Хоць |
| Б. … рэпу сей | 2. Куды |
| В. … сабака закапаны | 3. Дзе |
| Г. … вецер дзьме | 4. Як |
| | 5. Калі |

**Заданне 15.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Браць у свае … | 1. хаты |
| Б. Сесці не ў свае … | 2. рукі |
| В. Спаліць свае … | 3. сані |
| Г. Увайсці ў свае … | 4. берагі |
| | 5. караблі |

**Заданне 16.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Абы з рук | 1. Па значэнні адпавядае фразеалагізму *разяўляць рот* |
| Б. Разводзіць рукамі | 2. Мае значэнне “высока цаніць”. |
| В. Насіць на руках | 3. Мае значэнне “заключыць гандлёвую здзелку”. |
| Г. Ударыць па руках | 4. Па значэнні адпавядае фразеалагізму “рука набіта”. |

| | |
|---|---|
| | 5. Мае значэнне “вельмі нядбала, без ахвоты”. |

**Заданне 17.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Белая варона<br>Б. Начная зязюля<br>В. Вольная птушка<br>Г. Дойная карова | 1. Мае значэнне “не падобны на іншых людзей сваімі паводзінамі, знешнасцю”.<br>2. Па значэнні адпавядае фразеалагізму *бяздонная бочка.*<br>3. Мае значэнне “спрытны, дагодлівы чалавек”.<br>4. Мае значэнне “ні ад каго незалежны чалавек”.<br>5. Па значэнні адпавядае фразеалагізму *дарагая палавіна.* |

**Заданне 18.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Без цара ў галаве<br>Б. Гарачая галава<br>В. Галава на плячах<br>Г. Прытуліць галаву | 1. Па значэнні адпавядае фразеалагізму *вудзіць акунёў*.<br>2. Мае значэнне “хто-небудзь разумны, кемлівы”.<br>3. Мае значэнне “недалёкага, абмежаванага ўжытку”.<br>4. Мае значэнне “нястрыманы чалавек, дзейнічае паспешліва”.<br>5. Па значэнні адпавядае фразеалагізму *“прыбіцца да берага”*.. |

**Заданне 19.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Як … з канапель<br>Б. Дзе … козы пасе<br>В. Як … па пекле<br>Г. Як … прайшоў | 1. Марка<br>2. Мамай<br>3. Макар<br>4. Піліп |

| | |
|---|---|
| | 5. Саўка |

**Заданне 20.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| А. Эзопава …<br>Б. Бабіна …<br>В. Арыядніна …<br>Г. Фількава … | 1. грамата<br>2. лета<br>3. ніць<br>4. ноч<br>5. мова |

**Адказы**

1. А4, Б5, В1, Г2
2. А3, Б5, В4, Г1
3. А2, Б3, В1, Г5
4. А5, Б1, В2, Г3
5. А4, Б2, В5, Г1
6. А5, Б4, В3, Г2
7. А1, Б3, В2, Г5
8. А3, Б1, В5, Г2
9. А2, Б4, В1, Г3
10. А4, Б2, В5, Г1
11. А5, Б3, В4, Г2
12. А2, Б5, В1, Г4
13. А3, Б4, В2, Г1
14. А4, Б1, В3, Г2
15. А2, Б3, В5, Г4
16. А5, Б1, В2, Г3
17. А1, Б5, В4, Г2
18. А3, Б4, В2, Г5
19. А4, Б3, В1, Г2
20. А5, Б2, В3, Г1

**Літаратура**


1. https://knihi.com/none/Slounik_fraziealahizmau_djvu.zip.html



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА